Аляксандр
**ВАБІШЧЭВІЧ**

# ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ (1921–1936 гг.)

У беларускай савецкай гістарыяграфіі дзейнасць Таварыства беларускай школы з'яўлялася аб'ектам шэрага даследаванняў. Аднак навукоўцы ва ўмовах ідэалагічнага дыктату не мелі магчымасці аб'ектыўна, усебакова прааналізаваць гістарычны шлях гэтай масавай і ўплывовай культурна-асветніцкай арганізацыі Заходняй Беларусі 20—30-х гг. Таму варта пераасэнсаваць, аднавіць многія падзеі з летапісу ТБШ, вярнуць у гісторыю імёны тых, хто быў незаслужана забыты.

ТБШ было створана на Віленшчыне невыпадкова, бо там ужо з 1915 г. працавалі беларускія школы. На пасяджэнні Беларускай цэнтральнай школьнай рады ў Вільні 26 лютага 1921 г. быў ухвалены праект статута ТБШ[1]. Пасля дапрацоўкі Б.Тарашкевічам 1 ліпеня 1921 г. статут быў зацверджаны дэпартаментам унутраных спраў Сярэдняй Літвы. Было абвешчана, што асноўная мэта Таварыства — "пашыраць і памагаць асвеце ў беларускім нацыянальным, людскім і хрысціянскім духу". Разам з Б.Тарашкевічам ля вытокаў арганізацыі стаялі А.Луцкевіч, Ф.Аляхновіч, А.Смоліч, С.Рак-Міхайлоўскі, А.Станкевіч, М.Кахановіч і іншыя прадстаўнікі заходнебеларускай інтэлігенцыі.

Спачатку дзейнасць ТБШ насіла лаяльны характар да ўлад Сярэдняй Літвы, а потым і Польшчы. Выключная прыхільнасць да культурна-асветніцкай работы ў тагачасных абставінах гарантавала часовае захаванне ўжо існуючых ці стварэнне новых беларускіх школ. Хоць гурткоў у паветах на Віленшчыне было мала, але Таварыства прапагандавала ідэю стварэння нацыянальнай школы, аказвала дапамогу моладзі ў выездзе на вучобу за мяжу, фінансавала беларускія гімназіі (пераважна Віленскую) і некалькі пачатковых навучальных устаноў. Аднак у пачатку 20-х гг. сацыяльная база Таварыства была вузкая — у яго шэрагах пераважала інтэлігенцыя.

Пасля далучэння ў 1923 г. Віленшчыны да Польшчы ўзнікла патрэба аб'яднаць існуючыя беларускія школы пад эгідай ТБШ. Пра гэта ішла гутарка на з'ездзе настаўнікаў беларускіх гімназій у Вільні 11—14 красавіка 1923 г. Было прызнана неабходным, "каб усе беларускія сярэднія школы перайшлі ў рукі ТБШ, якое з'явіцца такім чынам гаспадаром названых школ у межах Польскай рэспублікі. Беларуская цэнтральная школьная рада (выканаўчы орган Таварыства. — **А.В.**) павінна ўзяць на сябе заступніцтва перад школьнымі і іншымі ўладамі за ўсе аб'яднаныя беларускія сярэднія школы, атрыманне дазволу, зацвярджэнне ўладай дырэктараў, агульнае кіраўніцтва і кантроль над унутраным жыццём школ з навукова-педагагічнага боку, правядзенне беларусізацыі там, дзе яна дагэтуль поўнасцю не скончана"[2].

З-за ўзмацнення ганенняў з боку польскай адміністрацыі і размежавання грамадска-палітычнага руху Заходняй Беларусі ў далейшым не ўдалося рэалізаваць рэзалюцыі з'езда і наладзіць рэгулярнае правядзенне падобных з'ездаў.

Стварэнне ў кастрычніку 1923 г. Кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), а затым Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ) надало Таварыству штуршок для пераўтварэння яго ў масавую культурна-асветніцкую арганізацыю. З восені 1924 г. была разгорнута кампанія па збору подпісаў за школу на роднай мове. Хоць да 1926 г. ТБШ мела структурныя адзінкі пераважна на тэрыторыі Віленскага ваяводства, а таксама ў Клецку і Навагрудку, але пастулова пашырыла свой уплыў на ўсе заходнебеларускія землі. "Я лічыў тады, што на грунце гэтай барацьбы за школу можна будзе стварыць з народных нізоў вялікую палітычную сілу", — заявіў на "працэсе Грамады" 16 мая 1928 г. Б.Тарашкевіч[3]. У пэўнай ступені гэтыя спадзяванні спраўдзіліся.

Пра значны ўплыў Грамады яскрава сведчаць вынікі выбараў 8 верасня 1926 г. у Галоўную ўправу ТБШ. У яе склад увайшлі Р.Астроўскі (старшыня), А.Уласаў, А.Трэпка (намеснікі), Б.Тарашкевіч, І.Дварчанін, М.Кепель, Я.Шнаркевіч, М.Марцінчык, Ф.Стэцкевіч, П.Мятла і інш.

З пашырэннем унутры Таварыства рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні не пагадзіліся дзеячы нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычных поглядаў. "БХД заўсёды добра разумела, што адна палітыка мала варта, што яе вартасць аказваецца праўдзівай тады, калі яна ідзе ў пару з працай культурна-асветнай для народу", — адзначаў А.Станкевіч[4]. Таму ў чэрвені 1926 г. дзеячамі Беларускага сялянскага саюза (БСС) і Беларускай хрысціянскай дэмакратыі быў створаны альтэрнатыўны ТБШ Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры (БІГіК) — культурна-асветная арганізацыя, якая вяла агітацыю супраць уплыву КПЗБ.

Пасля разгрому ў лютым 1927 г. БСРГ назіраўся рост гурткоў

ТБШ, бо кіраўнікі Грамады і КПЗБ загадзя паклапаціліся пра пераўтварэнне Таварыства ў "другую лінію акопаў". Выбраная на І з'ездзе ТБШ (28—29 снежня 1927 г.) Галоўная ўправа (старшыня — А.Трэпка) працягвала школьную кампанію. КПЗБ захоўвала станоўчы ўплыў і аўтарытэт у гуртках, павятовых і акруговых управах.

Аднак рэпрэсіі з боку польскага рэжыму "санацыі" ўзмацняліся. Не пазбегла іх і Таварыства беларускай школы. 28 жніўня 1928 г. была забаронена дзейнасць яго Галоўнай управы. Гэта паскорыла палярызацыю поглядаў у кіраўніцтве ТБШ. Імкненне да палітызацыі работы арганізацыі, за што выступалі найперш камуністы, а таксама прадстаўнікі беларускага пасольскага клуба "Змаганне" І.Дварчанін, Я.Гаўрылік і інш., было натуральным вынікам узмацнення рэвалюцыйна-дэмакратычных настрояў у грамадстве. У такой сітуацыі важна было стрымлівацца ад празмернай палітызацыі. Група дзеячаў нацыянальна-дэмакратычнай інтэлігенцыі (Р.Астроўскі, А.Луцкевіч, Я.Шнаркевіч і інш.) настойліва прапаноўвала сканцэнтравацца выключна на культурна-асветніцкай працы.

З восені 1928 г. раскол распаўсюдзіўся на акруговыя і павятовыя ўправы. І здарылася гэта тады, калі налічвалася 430 гурткоў Таварыства, якія аб'ядноўвалі 14–15 тыс. чалавек (паводле іншых звестак, да 500 гурткоў, дзе было да 30 тыс. членаў)[5].

У красавіку 1929 г. Рэвізійная рада ТБШ пад націскам рэвалюцыйна-дэмакратычных сіл прыняла рашэнне ліквідаваць Часовую паўнамоцную камісію, якая выконвала функцыі Галоўнай управы, і склікаць агульны з'езд 19 мая 1929 г. Камісія з гэтым не пагадзілася і запланавала правесці асобны з'езд у ліпені 1929 г.

У час падрыхтоўкі да з'езда КПЗБ рашуча выступала супраць закрыцця польскімі ўладамі гурткоў Таварыства. Пры гэтым зневажаліся імёны дзеячаў беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі, да іх прыклейваўся ярлык "нацыянал-фашыстаў". У выніку актыўнай прапагандысцкай кампаніі на з'езд былі выбраны камуністы, камсамольцы і іх прыхільнікі.

З'езд адбыўся нелегальна ў Вільні 19 мая 1929 г. Усе праціўнікі палітызацыі Таварыства былі выключаны з яго за "шкодную дзейнасць". У склад новай Галоўнай управы былі выбраны Ф.Стэцкевіч (старшыня), М.Пяткевіч, Р.Шырма, І.Дварчанін, Ф.Валынец, І.Грэцкі, П.Крынчык, М.Кепель, М.Марцінчык, П.Пяткун. Аднак пасля з'езда супрацьстаянне ўнутры арганізацыі не аслабла.

З'езд 9 ліпеня 1929 г. быў не такі прадстаўнічы, перавагу там складала інтэлігенцыя. Дэлегаты пацвердзілі сваю ранейшую

пазіцыю — абмежавацца толькі культурна-асветніцкай работай. Такое рашэнне было выгадным рэжыму "санацыі". А.Луцкевіч пастараўся змякчыць канфрантацыю ўнутры арганізацыі. Многія пункты рэзалюцыі былі прыняты якраз у яго рэдакцыі. Менавіта ён выступіў першым з прапановай зацвердзіць выбраную 19 мая 1929 г. Галоўную ўправу да наступнага з'езда. Пасля з'езда канструктыўная пазіцыя А.Луцкевіча была падвергнута вострай крытыцы як з боку камуністаў, так і згодніцкай групы Р.Астроўскага.

Нягледзячы на шматлікія патрабаванні польскіх улад аб "выдаленні падрыўных элементаў" з складу Галоўнай управы, усё-такі ў канцы жніўня 1929 г. забарона была знята, і яна атрымала магчымасць легальнага існавання. Гэта дазволіла надаваць больш увагі менавіта праблемам беларускай асветы. Аднак адсутнасць узаемаразумення, барацьба за ўплыў паміж рознымі палітычнымі сіламі зноў перашкаджалі эфектыўнасці ў працы ТБШ.

Неўзабаве пракацілася чарговая, больш знішчальная хваля рэпрэсій польскіх улад. Са жніўня 1930 да канца 1931 г. было закрыта каля 100 гурткоў. У пачатку 1932 г. з 7 акруговых упраў засталося толькі 3 — у Беластоку, Косаве, Ваўкавыску. З-за неаднаразовых арыштаў кіраўніцтва ў 1932—1933 гг. так і не ўдалося правесці агульны з'езд ТБШ. Для Таварыства наступілі змрочныя часы. Да восені 1932 г. агульная колькасць гурткоў зменшылася да 150[6]. У большасці паветаў іх дзейнасць спынілася.

Змены ў нацыянальнай палітыцы БССР у канцы 20-х гг. адбіліся і на заходнебеларускім камуністычным руху. Пра гэта сведчаць партыйныя справаздачы аб працы напярэдадні з'езда ТБШ, які планаваўся правесці ў маі 1932 г. (з-за паліцэйскіх ганенняў не адбыўся). "Сходы не былі выкарыстаны для арганізацыі выступленняў у вёсках, мястэчках, гмінах з патрабаваннем школы на роднай мове, супраць настаўнікаў-паланізатараў, хаця абурэнне людзей па гэтых пытаннях прысутнічала ў шэрагу прамоў на сходах гурткоў. На гэтых сходах нават не прапаноўваліся рэзалюцыі супраць закрыцця беларускай семінарыі (Віленскай. — **А.В.**), Навагрудскай гімназіі, скарачэння пасад настаўнікаў у Віленскай гімназіі"[7].

З боку дзеячаў КПЗБ выказваліся неабгрунтаваныя абвінавачванні ў адрас дэмакратычнай часткі кіраўніцтва Таварыства, што наносіла ёй велізарны ўрон. Цікавы момант прыгаданы ва ўспамінах сакратара Галоўнай управы Р.Шырмы: "Аднойчы прыходзіць да мяне ад КПЗБ хлопец са Стаўпеччыны (Стаўбцоўшчыны. — **А.В.**) Мікалай... і прапануе, каб я напісаў, што выходжу з Галоўнай управы ТБШ, тады, маўляў, мне на судзе лягчэй будзе (ім, як і панам, трэба было ліквідаваць ТБШ). А я кажу:

"Я не хачу, каб мне было лягчэй на судзе, я хачу, каб так, як другім было. Я не хачу, каб пасля мяне ўсё ганьбілі ў гісторыі, плявалі, што я памагаў пілсудчыкам ліквідаваць ТБШ"[8].

Згаданы суд над кіраўніцтвам Таварыства адбыўся 1—4 лютага 1933 г. Падпарадкаванне Галоўнай управы камуністычнаму падполлю не было даказана. Падсудныя публічна заявілі, што ім даводзілася змагацца як з польскімі ўладамі, так і з левасектанцтвам камуністаў і іх прыхільнікаў. Пазней у сваёй рэзалюцыі "Аб асноўных крыніцах нацыянал-апартунізму ў КПЗБ" (1934 г.) камуністычныя дзеячы палічылі за поспех "дэмаскаваньне сапраўднага твару цяперашняй Галоўнай управы ТБШ, на чале якой стаяць Шырма, Марцінчык, Стэцкевіч і іншыя агенты нацыянал-фашызму і польскай дэфензівы". Галоўная ўправа шальмавалася за розныя "грахі". "Шкодным" было прызнана сумеснае з БХД святкаванне ў 1932 г. юбілею Янкі Купалы. Недавер, падазронасць былі выказаны якраз да тых людзей, якія сваёй практычнай работай даказалі адданасць нацыянальным інтарэсам беларусаў.

Прыгнятаючае маральнае ўздзеянне аказвалі рэпрэсіі супраць інтэлігенцыі ў БССР. Відныя дзеячы нацыянальна-вызваленчай барацьбы Заходняй Беларусі М.Бурсевіч, П.Валошын, Ф.Валынец, Я.Гаўрылік, І.Дварчанін, П.Мятла, С.Рак-Міхайлоўскі былі прыцягнуты ў 1933 г. да сфабрыкаванай АДПУ справы "Беларускага нацыянальнага цэнтра", сталі ахвярамі сталінізму. У заходнебеларускіх вёсках і мястэчках у гэта не маглі адразу паверыць. "На шматлікіх сходах многія таварышы выказваліся так: "Каму ж цяпер можна верыць? Гэтыя ж паслы сядзелі ў турме, іх збівалі, а яны — здраднікі?"[9].

Але нават у такіх абставінах выкарыстоўваліся любыя магчымасці для асветніцкай працы. Замест "Бюлетэня ТБШ", газеты "Шлях" з мая 1933 г. Галоўная ўправа наладзіла выданне часопіса "Летапіс ТБШ". "Мы павінны імкнуцца... да наталення таго духоўнага голаду, які пануе на вёсцы, павінны шукаць шляхі, што лучылі б паміж сабой шчырых і свядомых, але распыленых па ўсёй Заходняй Беларусі, ідэйна адданых культурнай працы адзінак" — так была вызначана мэта часопіса ў яго першым нумары. Аднак да пачатку 1936 г. выхад часопіса быў спынены.

У той час найбольш моцнай заставалася Беластоцкая акруговая ўправа. Для яе было характэрна ідэйна-палітычнае адзінства, арганізацыйная згуртаванасць. Ставілася толькі пытанне аб легальным ці падпольным існаванні арганізацыі[10]. Безумоўна, польскія ўлады меркавалі ліквідаваць і яе. Спачатку яны беспаспяхова заклікалі да супрацоўніцтва з польскімі культурна-асветніцкімі арганізацыямі, патрабавалі вывесці з свайго складу прыхільнікаў

рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў. Хутка акруговая ўправа, якая трапіла пад пільную ўвагу камуністаў, адмовілася прызнаваць Галоўную ўправу, аказваць ёй матэрыяльную падтрымку, кляйміла яе "нацыянал-фашысцкай". "Санацыйныя" ўлады гэта выкарысталі — у сакавіку 1934 г. забаранілі працу ўправы ў Беластоку.

На фоне затухання працы Таварыства адбылося некаторае ажыўленне дзейнасці БІГіК. Аднак перашкоды з боку польскай адміністрацыі, фінансавыя цяжкасці, агульны заняпад вызваленчага руху не дазволілі наладзіць шырокую школьную кампанію. Камуністамі, камсамольцамі, піянерамі рабіліся спробы правядзення забастовак. 23 сакавіка 1934 г. у такой акцыі пратэсту супраць насаджэння польскіх школ прымалі ўдзел 2 тыс. вучняў. Нацыянальны нігілізм перашкаджаў камуністам пераўтварыць такія дэманстрацыі ў агульнакраёвыя выступленні супраць паланізацыі. На з'ездзе Таварыства, што адбыўся пры непасрэдным удзеле камуністаў нелегальна 17 чэрвеня 1934 г. у Вільні, было разгорнута чарговае шальмаванне Галоўнай управы, паўнамоцтвы якой перадалі выбранаму часоваму кіраўніцтву.

Змены ў стратэгіі і тактыцы міжнароднага камуністычнага руху (VII кангрэс Камінтэрна, 1935 г.), якія знайшлі ўвасабленне ў рашэннях II з'езда КПЗБ, паспрыялі ажыўленню працы ТБШ. Ва ўмовах узмацнення барацьбы за стварэнне антыфашысцкага народнага фронту ТБШ і БІГіК правялі ў 1936 г. сумесную школьную кампанію. Кіраваў ёй агульны Школьны сакратарыят. Быў дасягнуты некаторы поспех у Гродзенскім, Ваўкавыскім, Маладзечанскім і іншых паветах. Значэнне гэтай акцыі не столькі ў практычных выніках, колькі ў тым, што розныя палітычныя лагеры пачалі ўсведамляць рэальную небяспеку паланізацыі насельніцтва Заходняй Беларусі. Было таксама адноўлена выданне "Летапісу ТБШ". Удалося выбраць новую Галоўную ўправу, куды ўвайшлі Ф.Стэцкевіч, М.Кепель, В.Склубоўскі, Ф.Грышкевіч, Р.Шырма, М.Пяткевіч, М.Марцінчык, С.Паўловіч, М.Касцевіч і інш.

Цеснаму і шчыраму супрацоўніцтву ТБШ і БІГіК нярэдка перашкаджалі недаверлівыя адносіны паміж дзеячамі дзвюх партый, якія на іх уплывалі — КПЗБ і БХД (БНА). З боку камуністаў захоўвалася падазронасць да беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі, у тым ліку і з асяроддзя Таварыства. Пра гэта сведчаць матэрыялы II пленума ЦК КПЗБ (сакавік—красавік 1936 г.). "У галіне адукацыі створаны сумесны школьны камітэт (Школьны сакратарыят. — **А.В.**). Аднак пры гэтым былі дапушчаны і памылкі. Людзі, якія ўваходзяць ад ТБШ — чужыя нам. Памылкова дапусцілі Шырму"[11]. Пры гэтым трэба ўлічваць тое, што камуністычныя дзеячы вымушаны былі рабіць такія заявы ў сваіх

выступленнях, каб пазбегчы абвінавачванняў у нацыянал-фашызме ў свой адрас. "У галіне нацыянальнай за апошні час ёсць актывізацыя — рост самасвядомасці, але мы не арганізавалі і не кіравалі гэтым", — адзначалася ў матэрыялах II пленума ЦК КПЗБ[12].

Актывізацыя дзейнасці Таварыства выклікала ўзмацненне рэпрэсій з боку рэжыму "санацыі". 2 снежня 1936 г. ТБШ было закрыта. У пачатку 1937 г. гэтае рашэнне ўлады зноў пацвердзілі. Такі ж лёс напаткаў і БІГіК. 4 снежня 1936 г. яго дзейнасць была забаронена польскімі ўладамі. Гэта пашырыла для польскай дзяржавы магчымасці асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва.

У дадзеным кароткім артыкуле аб дзейнасці ТБШ вызначаны толькі асноўныя фактары, падзеі, асобы. **На этапе станаўлення (1921—1925 гг.)** Таварыства з'яўлялася яшчэ нешматлікай арганізацыяй. Аднак недаацэньваць зробленае сумеснымі сіламі інтэлігенцыі на ніве асветы нельга. **Найбольш плённы этап можна ўмоўна назваць "грамадаўскім" (1926—канец 20-х гг.).** У момант існавання Грамады і пасля яе разгрому ТБШ пераўтварылася ў моцную культурна-асветніцкую арганізацыю, рэальна супрацьдзейнічала планам паланізацыі Заходняй Беларусі. Аднак у пачатку 30-х гг. пачаліся знішчальныя ўдары з боку рэжыму "санацыі". Пазіцыі Таварыства падрывалі складанасці, цяжкасці ў разгортванні заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху, якія былі выкліканы з канца 20-х гг. найперш зменамі ў грамадска-палітычным жыцці БССР і СССР наогул. **30-я гады — гэта цяжкі і трагічны этап барацьбы за існаванне ТБШ.** Гісторыя стварэння і дзейнасці Таварыства патрабуе глыбокага і рознабаковага даследавання з выкарыстаннем як ужо вядомых, так і новых дакументаў і матэрыялаў з беларускіх і замежных архіваў.

---

[1] НА РБ, ф. 883, воп. 1, спр. 14, а. 22.
[2] БДАМЛМ, ф. 3, воп. 1, спр. 20, а. 40.
[3] Бергман А. Слова пра Браніслава Тарашкевіча. Мн., 1996, с. 124.
[4] Станкевіч А. Беларускі хрысціянскі рух. Вільня, 1939, сс. 206—207.
[5] Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.). Мн., 1978, с. 108; Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995, с. 698.
[6] НА РБ, ф. 242, воп. 1, спр. 532а, а. 75.
[7] Там жа, спр. 301, а. 41.
[8] Мастацтва, 1992, № 7, сс. 25—26.
[9] НА РБ, ф. 242, воп. 1, спр. 456а, а. 29.
[10] Studia polsko-litewsko-bialoruskie. W-wa, 1988, ss. 216—217.
[11] НА РБ, ф. 242, воп. 1, спр. 582а, а. 70.
[12] Там жа.

Ігар
КСЯНДЗОЎ,
Сяргей
КСЯНДЗОЎ

# Утварэнне Канфедэратыўных Штатаў Амерыкі

У гісторыі любой дзяржавы бываюць крытычныя моманты, якія радыкальна мяняюць увесь ход далейшага гістарычнага развіцця. Для сучасных Злучаных Штатаў Амерыкі (ЗША) такой падзеяй стала грамадзянская вайна 1861—1865 гг. паміж Поўначчу і Поўднем, якая падвяла своеасаблівую рысу



КСЯНДЗОЎ Ігар Уладзіміравіч нарадзіўся ў 1967 г. у Гомелі. Скончыў гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М.В.Ламаносава (1992 г.). Атрымаў ступень магістра універсітэта штата Паўночная Караліна (ЗША, 1994 г.). Займаецца пытаннямі гісторыі Поўдня ЗША другой паловы XIX ст.



КСЯНДЗОЎ Сяргей Уладзіміравіч – дацэнт Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1960 г. у Гомелі. Скончыў гістарычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (1982 г.). Займаецца пытаннямі палітычнай гісторыі XIX–XX стст.